■ Армейскі рэпартаж

КАБ КАШЫ ЯКАСНА ВАРЫЎ І БОРШЧ ВЫДАТНА ГАТАВАЎ!

Арам Мнацаканаў, вядучы тэлепраграмы «Пякельная кухня», аднойчы параўнаў удзел у кулінарным праекце са службай у войску. Маўляў, прыходзіш на яго праект хлопцам, а вяртаешся дадому ўжо сапраўдным мужчынам. У сваю чаргу, карэспандэнт «Звязды» наведаў адзінае месца ў Беларусі, дзе рыхтуюць вайсковых кухараў, і даведаўся, якія стравы гатуюць на абед салдатам тэрміновай службы.

«З МУЖЧЫН АТРЫМЛІВАЮЦЦА ЛЕПШЫЯ КУХАРЫ»

— Я шмат часу завіхаўся каля пліты яшчэ перад тым, як пайшоў у войска, — з лёгкай усмешкай кажа на дыктафон **радавы Антон ГАРШКОЎ.** — Гатаваць пачаў, калі мне было 14 гадоў. Маці казала, што ёй падабаліся бліны ў маім выкананні.

Тэрміновую службу Антон праходзіць у Пінску, але разам з іншымі саслужыўцамі з пагранічных атрадаў, часцей супрацьпаветранай абароны накіраваны на вучобу ў 114-ю школу па падрыхтоўцы прапаршчыкаў і спецыялістаў харчовай службы, якая знаходзіцца ў Печах, пад Барысавам. Кажа, што кожнаму з вайскоўцаў вучоба падабаецца, і лічыць, што тое пасведчанне кухара, якое салдаты атрымаюць пасля іспытаў, павінна спатрэбіцца і ў грамадзянскім жыцці.

У вялікай лабараторыі практычнага прыгатавання ежы, якая дзеліць адзін будынак са звычайнай салдацкай сталоўкай, заняткі ідуць поўным ходам. Памяшканне для тэарэтычнай падрыхтоўкі цяпер пустуе, затое на кухні ў вачах мітусіцца ад белага: хлопцы ў чыстых кухарскіх кашулях і каўпаках шчыруюць каля пліты — нехта гатуе ячную кашу, варыць наварысты боршч, астатнія наразаюць свежую агародніну для салаты. Тое, што адбываецца, крыху нагадвае сучаснае кулінарнае ток-шоу, дзе людзі змагаюцца за прэстыжную працу ў вядомым рэстаране. У салдатаў, безумоўна, спецыфіка іншая. Пасля завяршэння вучобы яны працягнуць службу ў сваіх часцях, дзе будуць гатаваць для дзясяткаў саслужыўцаў. А таму кулінарныя веды для іх, зразумела, на вагу золата.

— Калі салдаты толькі прыязджаюць да нас, у іх пачынаюцца заняткі па тэорыі, — тлумачыць спецыфіку вучобы **Надзея ЗАВАЦКАЯ, майстар вытворчага навучання,** якая ўжо 17-ы год рыхтуе ваенных кухараў. — А ўжо праз тры тыдні стартуюць сапраўдныя практычныя заняткі.

Надзея Завацкая для хлопцаў — нібы сапраўдная кулінарная энцыклапедыя. Падкажа хлопцам кожную дробязь. І можна толькі ўявіць, колькі ў яе выпускнікоў, калі кожны год ШПП выпускае больш за 100 армейскіх «кокаў».

— У нашай школе хлопцы вучацца гатаваць баршчы, расольнікі, капусту, тэфтэлі, рагу, бефстрогановы... Карацей, гатуюць усё тое, чым пасля будуць карміць людзей у сваіх часцях. І ўсё гэта згодна з меню. Кожны дзень кухараць нешта новае, — працягвае Надзея Якаўлеўна.

— Цікава, а як вы ацэньваеце падрыхтоўку будучых кухараў?

— Матэрыял праграмы падаём праз лекцыі. Падчас практыкі я гадзіну тлумачу, якім чынам трэба гатаваць пэўную страву, а пасля назіраю за іх працай, каб хутчэй прывыкалі да самастойнасці. Ёсць і кантрольныя заняткі, дзе хлопцы пісьмова адказваюць на пытанні наконт тэхналогіі гатавання страў, апісваюць санітарныя патрабаванні... Напрыканцы навучання яны здадуць іспыты і атрымаюць пасведчанне кухара 3-га разраду. Двойкі, дарэчы, яшчэ нікому не ставілі.

Радавы Антон ГАРШКОЎ: «Я шмат часу завіхаўся ля пліты яшчэ перад тым, як пайшоў у войска».

— Мяркую, што часам даводзіцца працаваць з салдатамі, якія ніколі нават не падыходзілі да пліты.

— Я наогул думаю, што з мужчын атрымліваюцца лепшыя кухары. І гатуюць яны з душой, з асалодай. Зразумела, сярод салдатаў трапляюцца і тыя, хто першапачаткова не збіраўся працаваць кухарам. Акрамя яечні, і прыгатаваць нічога не могуць, але прыходзіцца вучыцца. І калі ў іх пачынае атрымлівацца, ім становіцца ўжо цікава, а пасля радасныя, задаволеныя кажуць бацькам, што ў іх атрымалася, іх пахвалілі за працу. Дарэчы, ёсць сярод навучэнцаў і тыя, хто пасля вяртання з войска пайшоў працаваць кухарам.

— А ці прыходзяць да вас падзякі з часцей, дзе на кухнях працуюць вашы выхаванцы?

— На нашых іспытах, дарэчы, заўжды прысутнічае прадстаўнік пагранічных войскаў. І водгукі, якія мы атрымліваем з часцей, звычайна таксама добрыя.

ПРЫГАТУЙ ДОБРА І АТРЫМАЙ АДПАЧЫНАК

Гвардыі прапаршчык Віталь Тунчык, які падчас нашага візіту выконваў абавязкі камандзіра вучэбнай роты па падрыхтоўцы спецыялістаў харчовай службы, сам вучыўся на кухара ў гэтай школе, а таму на кухні лёгка заўважае любы хіб, падказвае салдатам.

— Памылкі найчасцей робяць з-за няўважлівасці. Але хлопцы гатуюць выдатна. На мой погляд, асабліва добра ў іх атрымліваюцца боршч і гуляш. Я характарызую іх з лепшага боку. Час ад часу праверыць дабраякаснае прыгатаванне ежы да салдатаў у лабараторыю заходзіць гвардыі падпалкоўнік Уладзімір Баранскі, начальнік 114 ШПП, і таксама застаецца задаволены прыгатаванымі стравамі.

Гвардыі прапаршчык Віталь ТУНЧЫК характарызуе будучых кухараў з лепшага боку.

Віталь ТУНЧЫК падкрэслівае: нягледзячы на тое, што цяпер салдаты знаходзяцца ў вучэбнай часці, дысцыпліна ў іх ніяк не змянілася. «Карыстацца сродкамі сувязі можна толькі ў суботу пасля вячэры і ў нядзелю. Акрамя асноўнай спецыялізацыі, курсанты вывучаюць вайсковыя статуты, займаюцца фізічнай падрыхтоўкай, страляюць на палігоне. Як адпачываюць? На футбол у Барысаў з вайскоўцамі мы не ездзілі, а вось канцэрт у гарадскім Доме культуры ўжо наведвалі. За добрае нясенне вайсковай службы салдат можа атрымаць і падзяку, і сутачнае звальненне. Зразумела, сустракаюцца сярод іх і тыя, у каго бываюць праблемы з дысцыплінай, але мы вельмі хутка выпраўляем сітуацыю».

«ЗАНАТОЎВАЕМ РЭЦЭПТЫ З КУЛІНАРНЫХ ПРАГРАМ»

Пакуль мы размаўляем з таварышам прапаршчыкам, хлопцы ўжо амаль зрабілі сабе абед. Наш новы знаёмы Антон Гаршкоў тым часам стаіць ля духоўкі — чакае, калі прыгатуюцца катлеты са свініны.

— Мне здаецца, што кожнаму з нас падабаецца гатаваць, — акідвае Гаршкоў позіркам сваіх саслужыўцаў, якія па чарзе дэгустуюць прыгатаваныя стравы. — У вольны час праглядаем кулінарныя праграмы. Запамінаем, занатоўваем рэцэптуру. Хто ведае, можа, падобная інфармацыя нам таксама будзе карыснай? Сёння, дарэчы, на абед у нас будзе боршч, груца з агароднінай і катлетамі, салата і кісель.

Абедаюць салдаты ў лабараторыі тымі стравамі, якія прыгатавалі на практычных занятках.

Праз хвіліну Антон нахіляецца над духоўкай і спрытна дастае бляху з гарачымі катлетамі.

— І як вы іх гатавалі?

— Са свежай свініны зрабілі фарш, абвальвалі масу ў муцэ, — з веданнем справы адказвае радавы Гаршкоў. — А пасля абсмажвалі з двух бакоў да чырвонай скарынкі. Напрыканцы адпраўлялі катлеты ў смажыльную шафу да поўнага прыгатавання.

Як кажа Антон, снедаюць і вячэраюць салдаты ў сталоўцы, а абедаюць у лабараторыі тымі стравамі, якія прыгатавалі на практычных занятках. Такая спецыфіка навучання, каб самі добра адчувалі якасць і смак прыгатаванай ежы.

Напрыканцы нашай сустрэчы Антон кідае наўздагон, што і дома ён дакладна будзе галоўным кухарам у сям'і: «Думаю, жонка на кухні мяне не перагоніць!» Што дадаць, добрае жаданне, якое, як аказваецца, прыйшло да хлопца менавіта падчас службы ў войску.

Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара.
Барысаўскі раён

■

ЦЁПЛЫ ПРЫЁМ — СЛУЖБА З АГЕНЬЧЫКАМ

Менавіта так і прынята працаваць з афіцэрскім папаўненнем у 72-м гвардзейскім Аб'яднаным вучэбным цэнтры падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў.

Сёлета вучэбнае злучэнне атрымала вялікае (па сённяшніх мерках) папаўненне прафесіяналаў. Месяц таму ў распараджэнне камандавання 72-га гвардзейскага АВЦ прыбылі 27 маладых афіцэраў. Пятнаццаць лейтэнантаў скончылі Ваенную акадэмію, астатнія маладыя прафесіяналы вучыліся на ваенных факультэтах у іншых ВНУ краіны.

Пасля прыбыцця афіцэраў-навічкоў у Печы з кожным з іх персанальна пагутарыў выканаўца абавязкаў начальніка 72-га гвардзейскага АВЦ гвардыі палкоўнік Сяргей Новік. Яго цікавіла літаральна ўсё: настрой на службу, сямейнае становішча, планы на перспектыву. На месцы былі вырашаны праблемы як службовага, так і асабістага характару. Такім чынам, напрыклад, лейтэнанту Яўгену Гарбачову дапамаглі з пераводам і працаўладкаваннем яго жонкі ў мясцовую школу № 7 настаўніцай матэматыкі.

Змаглі вырашыць і адну з надзённых праблем — размяшчэнне выпускнікоў. Адшукаўшы рэзервы, усіх халасцякоў, якія мелі патрэбу ў жыллі, размясцілі ў загадзя адрамантаваных пакоях афіцэрскага інтэрната. Жанатым выдзелілі асобныя пакоі сямейнага тыпу. Паводле слоў саміх выпускнікоў, жыллёвыя ўмовы іх цалкам задавальняюць.

Як расказаў **начальнік аддзялення кадраў АВЦ гвардыі падпалкоўнік Вадзім МЯЦЕЛЬСКІ**, амаль палова выпускнікоў накіравана на кадравае ўзмацненне цэнтраў тылавога і тэхнічнага забеспячэння. У гэтых вайсковых часцях да ўсіх афіцэраў-навічкоў паставіліся клапатліва. З першага дня службы за кожным замацавалі вопытных і аўтарытэтных настаўнікаў, якія цярпліва і настойліва вучаць лейтэнантаў усім прамудрасцям і тонкасцям вайсковага жыцця, аказваюць ім дапамогу і словам, і справай.

— Задаволены, што старт маёй службы пачаўся ў вайсковай «вучэбцы», — заўважыў у гутарцы **лейтэнант Аляксей ДЗЯЛЕНДЗІК,** прызначаны на пасаду начальніка харчовай службы цэнтра тылавога забеспячэння. — З першага дня адчуў сябе паўнавартасным членам афіцэрскага калектыву. Адчуваецца дзелавая і маральная падтрымка з боку старэйшых таварышаў. Мне давяраюць і разлічваюць на мяне. Падобнае стаўленне не дазваляе расхалоджвацца. Стараюся адказна ставіцца да службовых абавязкаў, унікаць ва ўсю тонкасць арганізацыі харчавання ваеннаслужачых. З такой падтрымкай і цёплым прыёмам у часці можна горы звярнуць!..

Лейтэнанты Дзмітрый Ракіцкі і Андрэй Руткоўскі не толькі разам вучыліся на ваенна-тэхнічным факультэце БНТУ, але і трапілі на службу ў адну вайсковую часць — цэнтр тэхнічнага забеспячэння. Нават пасады ў іх аднолькавыя: абодва прызначаны намеснікамі камандзіраў рот забеспячэння вучэбнага працэсу па ўзбраенні.

Маладыя афіцэры разумеюць — служыць у гэтай часці няпроста: ненармаваны працоўны дзень, бесперабойнае забеспячэнне тэхнікай планавых заняткаў курсантаў, падтрыманне яе ў спраўным стане, работа з дакументацыяй... Але цяжкасці іх не пужаюць. Тым больш што тут створаны нармальныя ўмовы для жыцця і службы.

— У поўнай меры ўсведамляю адказнасць, якая лягла на мае плечы, — патлумачыў у ходзе гутаркі **лейтэнант Дзмітрый РАКІЦКІ.** — У падначаленні — вадзіцельскі склад, каля двух дзясяткаў адзінак тэхнікі вучэбна-баявой групы. — Гэта сур'ёзна. Тэарэтычных ведаў па спецыяльнасці атрымаў на факультэце дастаткова, а вось практыкі малавата. Але справа гэта нажыўная. З абавязкамі стараюся спраўляцца.

Выпускнік агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі лейтэнант Аляксандр МАЦВЕЕЎ са сваімі падначаленымі ў час палявога выхаду.

Добрую кадравую падтрымку цяпер атрымала і 3-я гвардзейская школа падрыхтоўкі спецыялістаў танкавых і артылерыйскіх падраздзяленняў. Вайсковы калектыў вучэбнай часці папоўніўся адразу пяццю выпускнікамі Ваеннай акадэміі. Усіх іх размеркавалі на раўназначныя капітанскія пасады.

Гвардыі лейтэнанты Мікалай Каспяровіч і Дзмітрый Пазняк не толькі вучыліся на агульнавайсковым факультэце, але і разам трапілі служыць у адну роту камандзірамі вучэбных танкавых узводаў. На дваіх ім нават выдзелілі добраўпарадкаваны пакой у афіцэрскім інтэрнаце, дзе аднакурснікі маюць магчымасць не толькі адпачыць пасля цяжкага ратнага дня, а і абмеркаваць агульныя для іх пытанні па службе. Пастаянныя стасункі сяброў даюць дадатковыя сілы ў афіцэрскім станаўленні.

— Без усялякага разгойдвання прыняў узвод курсантаў з трыццаці чалавек, — расказвае **гвардыі лейтэнант Мікалай КАСПЯРОВІЧ** са Смалявіцкага раёна. — Ва ўсіх адукацыя не ніжэй за сярэднюю тэхнічную. Настрой на вучобу ў хлопцаў ёсць. Значыць, будуць і вынікі. Ужо праз тыдзень разам з падраздзяленнем займаўся на палігоне. Цяжкавата спачатку даводзілася. Калі ў акадэміі, па сутнасці, адказваў толькі за сябе, то ў полі «ружовыя акуляры» давялося зняць. Ніякіх патуранняў, скідак на маладосць і нявопытнасць тут няма. Калі ўжо ў цябе на пагонах зоркі, будзь ласкавы падрыхтаваць вучэбна-матэрыяльную базу да заняткаў, метадычна граматна адпрацаваць з падначаленымі вучэбныя працэсы, прасачыць за выкананнем мер бяспекі.

Дастаткова хутка ўвайшоў у працоўны рытм і гвардыі лейтэнант Аляксандр Мацвееў. Дарэчы, родам Аляксандр з Печаў, нарадзіўся ў сям'і вайскоўцаў. Не дзіўна, што ён стаў афіцэрам-танкістам па прыкладзе свайго бацькі, які, дарэчы, таксама пачынаў службу ў гэтай жа вучэбнай часці.

— У нас у вайсковай часці цалкам рэальна пры нармальным стаўленні да службы за кароткі час атрымаць у падначаленне і роту, — патлумачыў **лейтэнант Яўген Бутар, прызначаны на пасаду камандзіра ўзвода КШМ.** — Трэба толькі старанна працаваць, набірацца вопыту. А наогул ёсць вялікае жаданне прайсці службовыя прыступкі і ў перспектыве паступіць на камандна-штабны факультэт Ваеннай акадэміі. Трывалых ведаў і навыкаў да таго часу, думаю, хопіць.

У маладых афіцэраў працягваецца нялёгкая пара станаўлення. Вельмі хацелася б, каб ва ўсіх іх афіцэрская кар'ера і асабістае жыццё склаліся ўдала. Поспехаў вам, лейтэнанты!

Мікалай МАКАРЭВІЧ.
Фота аўтара.

ЖЫЦЦЁ Ў СТЫХІІ ВАДЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

— Вы ўвесь час рухаліся ўверх па кар'ернай лесвіцы. Няўжо не было перашкод?

— Калі ўтварылася 4-я флатылія атамных падводных лодак 2-га пакалення (гэта караблі абсалютна іншыя), мяне прызначылі намеснікам камандзіра флатыліі па электрамеханічнай частцы — на контр-адміральскую пасаду. Даводзілася правяраць лодкі, вырашаць — пойдуць яны сёння ў мора ці не. Адна забарона стала для мяне лёсавызначальнай...

Быў 1978 год. Пасля рамонту да нас прыйшла лодка «К-23» — лодка 1-га пакалення, але з ракетным комплексам. Яе стан быў жудасным. Вядома, я забараніў яе эксплуатацыю. Прайшлі суткі. Мяне вызывае камандуючы флатыліі і пытае, чаму я не выпускаю лодку? На што я кажу, што яна мае вельмі шмат недахопаў і асабовы склад слаба падрыхтаваны. На што ён мне адказаў: «Яна павінна быць падрыхтавана. Па загадзе камандуючага флотам, яна павінна прыйсці ў гавань». Свайго меркавання я не змяніў. У 3 гадзіны ночы — званок: прыбыць на камандны пункт. Я прыязджаю, а камандуючы флатыліі мне і кажа: «На «К-23» аварыя. З рэактарам нешта. Разбірайцеся. Там знаходзіцца ваш намеснік Слава Маркін». Я звязваюся з ім па сувязі і даведваюся пра дрэннае становішча. Даю парады, кажу, што перш за ўсё трэба ратаваць людзей. Вячаслаў выканаў усё як трэба, але атрымаў вялікую дозу апрамянення. Праз паўгода ён памёр.

З гэтай справай прыехала разбірацца камісія — 60 чалавек на чале з адміралам флоту Бандарэнкам. Была вельмі складаная псіхалагічная сітуацыя. Я атрымаў нават мікраінфаркт. Праўда, гэтага не заўважыў: мне пра яго потым у шпіталі сказалі. Ніхто не мог высветліць прычыну аварыі лодкі. Я прыйшоў да высновы, што трэба на месцы разбірацца, адкуль ідзе радыяцыя. Са мной пайшоў малады хлопец, камандзір дывізіёна. У астатніх была адгаворка: «Я хачу жыць». Мы знайшлі пашкоджаны канал, з якога паступала радыяцыя. Я даказаў гэтым учынкам, што асабовы склад не вінаваты, а за трагедыю адказны завод, які дапусціў дэфект пры мантажы. Пасля гэтай сітуацыі я атрымаў прамянёвую хваробу і ўжо быў не годным для далейшай службы на караблях.

— І на гэтым ваша кар'ера як марака скончылася?

— Мой камандуючы флатыліі загінуў у авіякатастрофе разам з 35 адміраламі ваенна-марскога флоту. На яго пасаду прыйшоў новы чалавек. У гэтай сітуацыі патрэбна было паставіць кропку. Тое, што я папярэджваў аб магчымай трагедыі і што сам пасля ўдзельнічаў у ліквідацыі яе наступстваў, нікога не хвалявала. Прыйшоў загад прызначыць мяне намеснікам начальніка вучэбна-выпрабавальнага цэнтра ў Камсамольску-на-Амуры. У мяне ўзнікла іншая задача — падрыхтоўка экіпажаў на караблі 3-га пакалення. Гэта было не для мяне: я ўвесь час праводзіў у моры, сядзець у кабінеце і складаць графікі ўрокаў мяне зусім не задавальняла. Я напісаў заяву. Папрасіў перавесціся ў Мінск.

— І так вы аказаліся ў вучэбна-выпрабавальным цэнтры Мінабароны ў Соснах?

— Так. Прыбыў я сюды ў 1984 годзе. Пяць гадоў працаваў на пасадзе намесніка начальніка цэнтра па вучэбна-выпрабавальнай рабоце. Тут распрацоўваліся праекты па стварэнні перасоўнай атамнай энергетычнай устаноўкі. Аператарамі кіравання гэтай устаноўкай былі падабраны афіцэры ваенна-марскога флоту. Памылка заключалася толькі ў тым, што яны выбралі няўдалы праект. І хоць пасля ў цэнтра былі іншыя задачы, патрэбна аддаць належнае нашаму Прэзідэнту, што яго захавалі.

Дарэчы, калі пачаліся чарнобыльскія падзеі, мы першымі звярнулі ўвагу на павышаную дозу радыяцыі ў паветры. Прыборы зашкальвалі. Мы думалі, што ў нас здарылася надзвычайная сітуацыя. Я ў той час часова выконваў абавязкі начальніка цэнтра, і на мяне лягла адказнасць за выратаванне людзей. Мы выканалі ўсе мерапрыемствы: усіх апавясцілі, далі каманду зачыніць усе вокны і, па магчымасці, іх абклеіць, каго можна, адправілі ў бамбасховішча. Затым я патэлефанаваў у Міністэрства абароны і далажыў абстаноўку. Яны ўсё ведалі, сказалі, што радыяцыя ідзе не ад нас. На наступны дзень мы даведаліся пра Чарнобыль.

— Пазней разам з членамі грамадскага аб'яднання «Беларускі камітэт ветэранаў падраздзяленняў асаблівай рызыкі» вы выдалі кнігу «Атамныя салдаты Беларусі». Выданне прысвечана героям чарнобыльскіх падзей?

— Не толькі ім. Увогуле кніга напісана людзьмі, якія аддалі лепшыя гады жыцця стварэнню і ўмацаванню «ядзернага шчыта» дзяржавы.

— А хто яны — ветэраны падраздзяленняў асаблівай рызыкі?

— Па-першае, гэта людзі, якія ўдзельнічалі ў чарнобыльскіх падзеях. Па-другое, ваеннаслужачыя і служачыя, якія займаліся распрацоўкай, стварэннем і выпрабаваннем ядзернай зброі. Па-трэцяе, гэта маракі, якія абслугоўвалі атамныя падводныя лодкі і ўдзельнічалі ў ліквідацыі аварый на іх. Усіх гэтых людзей аб'ядноўвае тое, што яны пры выбары прафесіі добра ўсведамлялі, што іх чакае і з чым яны сутыкнуцца. Самае галоўнае, што гэтыя людзі не былі прызначанымі на тыя ці іншыя пасады — яны самі выбралі такую прафесію. Сёлета арганізацыя адзначыла 20-годдзе. У 1993 годзе нас было 4 тысячы чалавек. Зараз засталося ўдвая менш.

— Чым сёння займаецца грамадскае аб'яднанне?

— Самае галоўнае для нас — перадаць вопыт моладзі, якая выхоўваецца ў тых працоўных і баявых традыцыях. Таму рэгулярна сустракаемся са школьнікамі, гімназістамі, студэнтамі. Штогод мы праводзім тэматычныя канферэнцыі. Бліжэйшая мэта ветэранскай арганізацыі — стварыць гісторыка-краязнаўчы каляндар «Мінск. Міншчына», які будзе расказваць пра гарады, дзе прайшлі дні пісьменства. Яшчэ адзін вектар нашай дзейнасці — аказанне дапамогі хворым. Многія з іх у вельмі цяжкім стане. І галоўную задачу, якую я стаўлю перад сабой, — стварыць цэнтр рэабілітацыі гэтых людзей. Для таго, каб яны безнадзейна не бегалі па паліклініках і бальніцах. Кожны з іх спрабуе даказаць, што ён можа разлічваць на льготы. А каб іх атрымаць, патрэбна патлумачыць прычынна-выніковую сувязь: даказаць, што ты служыў і гэта стала прычынай тваёй хваробы. А гэта не так проста... Са стварэннем рэабілітацыйнага цэнтра можна было б забіць адразу двух зайцоў: падтрымаць здароўе ветэранаў і не дапусціць сур'ёзных захворванняў у маладых спецыялістаў, якія будуць працаваць на беларускай АЭС.

— Алег Паўлавіч, а як вы ставіцеся да будаўніцтва на нашай зямлі атамнай электрастанцыі? Скажыце шчыра, ці варта нам чакаць пагрозы?

— Ведаеце, сучасныя ядзерныя энергетычныя ўстаноўкі — выключна надзейная тэхніка. І трэба быць дурнем, каб дапусціць аварыю на АЭС. Калі раней мы спасылаліся на тэхніку, то зараз вопыт эксплуатацыі энергетычных установак настолькі высокі, што сучасная ўстаноўка мае 5 ступеняў абароны. У выпадку аварыі актыўнай зоны прадугледжана не ўскрываць яе і даставаць наверх, а спускаць уніз — у спецыяльны кантэйнер, які не дапусціць распаўсюджванне радыяцыі ні праз глебу, ні праз рэкі. Калі раптам аператар кіравання дапусціць памылку, яна імгненна фіксуецца, адразу выдаецца сігнал на абарону рэактара, і рэакцыя спыняецца. Ды ўвогуле дапусціць памылку абслуговы персанал проста не мае права!

— Прафесія, якой вы прысвяцілі большую частку свайго жыцця, мяккажучы, не з лёгкіх. Не толькі добры напамін пакінула пасля сябе праца атамшчыка-падводніка. А каб у вас была магчымасць пражыць жыццё наноў, ці склаўся б ваш лёс па-іншаму?

— Я, безумоўна, ізноў пайшоў бы па гэтым шляху. Хоць мая мара аб будаўніцтве караблёў і не ажыццявілася. Сыходзячы з флоту, я вельмі пакутаваў. Усе гады маю душу не пакідаў цяжар, мучыла нездаволенасць. Я настолькі любіў флот, што не мог без яго ўявіць жыцця. Я лічу, што ўсе мае хваробы — наступствы не столькі ад апрамянення, колькі ад перажыванняў, што замест падзякі ні за што панёс пакаранне. І калі я ад Аляксандра Рыгоравіча, які ў сваіх моцных руках трымае штурвал лайнера пад назвай «Беларусь», атрымаў гэты ордэн, мне стала лягчэй, душа супакоілася.

❒ ❒ ❒

...На працягу жыцця, поўнага цяжкасцяў і выпрабаванняў, разам з Алегам Есіным — яго жонка. Сёння яна дапамагае адказваць на мае пытанні, раскрывае сакрэты іх шчаслівага сямейнага жыцця. «У чым сакрэт? А ў тым, што я заўсёды была яму карыснай, — прызнаецца Ларыса Мікалаеўна. — У тым, што мы дапаўняем адно аднаго. У мяне муж вельмі сур'ёзны, а я аптыміст — неабходная якасць, асабліва для жанчыны. Ды і як без кахання? Менавіта не запалу, а любові да чалавека, да яго якасцяў, душы. Патрэбна так любіць, каб ты быў патрэбны другому. Самае каштоўнае — адносіны паміж людзьмі».

Яе называлі дзекабрысткай: людзі не разумелі, як можна з Мінска ляцець на Камчатку з маленькімі дзецьмі. І яна, дачка франтавіка і ўнучка ўдзельніка грамадзянскай вайны, усё лёгка пераносіла: увесь час працавала настаўніцай там, дзе служыў муж. І трэба сказаць, што з роляй жонкі марскога афіцэра Ларыса Есіна справілася на «выдатна».

Гутарыла Вераніка КАНЮТА.
Фота аўтара.

■ З рэдакцыйнай пошты

СТРАЧАНАЕ ДЗЯЦІНСТВА

Вайна абрынулася на нас, дзяцей, так, як і на дарослых, — бомбамі, снарадамі, кулямі, голадам, холадам, разлукай. Але і ў гэтыя гады дзеці былі першым клопатам народа. Выжывем мы — выжыве краіна, яе гісторыя, ідэалы, будучыня.

Якой мерай чалавечага ўсведамлення можна вызначыць маральны подзвіг шасцігадовага Толі Новікава, які 21 чэрвеня 1941 года з мамай і сястрой планаваў эвакуіравацца з Беластока хуткім цягнікам на Мінск і далей у Саратаў, дзе жыла яго бабуля? 22 чэрвеня раніцай прыбыў у Ліду хуткі цягнік. Фашысцкія сцярвятнікі яго разбамбілі. Толю цяжка параніла ў правую руку. Яго адвезлі ў бальніцу, дзе аднялі канечнасць вышэй за локаць. Пасля яго змясцілі ў дзіцячы дом горада Ліда. Там ён скончыў 10 класаў і ў гэты час (незразумела, якім чынам і як) навучыўся іграць на баяне. Пазней паступіў у Гродзенскае музычнае вучылішча, скончыў яго і быў накіраваны выкладчыкам па класе баяна ў музычную школу ў Жодзіна. Гэта пра яго пісьменнік Іван Панчанка напісаў аповесць «І вечнай будзе музыка».

...Пры абароне нашых рубяжоў на рацэ Днепр у ліпені 1941 года ў доме Турбінскіх, якія жылі ў вёсцы непадалёк ад Дняпра ў Шклоўскім раёне, размяшчаўся штаб дывізіі. Тут засталося шмат вайсковага абмундзіравання. Бацька быў на фронце. Маці з дзецьмі абмундзіраванне схавала ў агародзе, а пасля перадала партызанам.

Фашысты, захапіўшы вёску і даведаўшыся, што ў доме Турбінскіх размяшчаўся штаб дывізіі, уначы ўварваліся ў хату і ўчынілі вобыск. Шукалі і ў агародзе, і на гарышчы, і ў хляве... Нічога не знайшоўшы, катавалі сям'ю, зверскі збілі маці і дзяцей, пагражаючы расстрэлам. Цудам выжылі.

У сям'і Турбінскіх было восем дзяцей. Старэйшы з іх, Пётр, у 1941 годзе скончыў першы курс Ленінградскага дарожнага тэхнікума. На пачатку вайны будаваў абарончыя рубяжы пад Ленінградам. У цяжкія дні блакады 16-гадовы Пётр добраахвотнікам пайшоў на фронт — на абарону горада. Быў цяжка паранены. Пасля лячэння накіраваны на Заходні фронт у Беларусь. У складзе другога Беларускага фронту ў 1944 годзе вызваляў малую радзіму — Шклоўскі раён. Пётр Турбінскі дайшоў да Берліна, распісаўся на Рэйхстагу. Вярнуўся дамоў, але пасля раненняў рана памёр. Яго ўнучка — вядомая спявачка Іна Афанасьева.

...За сямнаццаць кіламетраў ад Рыгі знаходзіўся канцэнтрацыйны лагер Саласпілс. У ім забілі сто тысяч чалавек, у тым ліку сем тысяч дзяцей. Іх звозілі сюды зімой 1943 года, калі немцы правялі карную экспедыцыю ў партызанскіх раёнах Беларусі. Ва ўсіх іх рэгулярна бралі кроў. Пяць скрыняў з ампуламі дзіцячай крыві лагер штодня пастаўляў арміі нямецкіх вылюдкаў.

Пры вызваленні Гомельскай вобласці нямецка-фашысцкія захопнікі, адступаючы пад ударамі Чырвонай Арміі, пакінулі ля мястэчка Азарычы тры канцэнтрацыйныя лагеры, у якіх утрымліваліся дзеці, жанчыны, старыя з Гомельскай, Палескай, Магілёўскай абласцей. Усе яны былі хворымі на сыпны тыф. Часцямі Чырвонай Арміі з трох лагераў смерці было вызвалена больш за 32 тысячы савецкіх грамадзян — старых, жанчын і дзяцей. Сярод іх 15213 дзяцей ва ўзросце да 13 гадоў, у тым ліку 517 сірот, бацькі якіх былі забітыя або загінулі ў гэтых лагерах.

...Мы памятаем, узгадваем сваіх бацькоў, родных і блізкіх, усіх палеглых на вайне. Але хто ўспамінае нас, дзяцей ваеннай пары, якія адчулі ўсе жахі ваеннага ліхалецця, якое забрала ў нас бацькоў, братоў, сясцёр, родных і блізкіх — і наша дзяцінства? У які дзень дзяржаўнай памяці беларускага народа ўспамінаюць дзяцей ваенных гадоў — асабліва гістарычнае пакаленне беларускага народа, дзякуючы якому працягваецца жыццё нашай нацыі? Дзеці ваеннай пары сталі той працоўнай сілай, якая дапамагала з руін уздымаць гарады, прамысловасць і сельскую гаспадарку. Можа, мэтазгодна ім вызначыць дзяржаўны статус «Дзеці вайны»?

Нас засталося ўжо зусім мала. Дык паспяшайцеся зрабіць усё магчымае, каб дзеці ваеннай пары, якія бачылі на свае вочы жудасныя злачынствы нямецкіх забойцаў, расказалі наступным пакаленням, як яны абаранялі Радзіму, як яны выжылі... Мы нічога не перабольшваем. Мы проста хочам, каб новыя пакаленні ведалі і памяталі пра гераізм сваіх равеснікаў, натхняючыся іх біяграфіямі, угледзеліся ў характары тых, хто павінен стаць для іх не толькі легендай, але і высокім узорам, годным захаплення і пераймання. Яны ўжо адыходзяць з жыцця, а многія ўжо пайшлі... Дык давайце паспяшаемся заслужана аддаць высокі гонар дзяржавы дзецям ваеннай пары, юным абаронцам Радзімы!

Уладзімір і Міхаіл УТКІНЫ.

Ад рэдакцыі: *Шаноўныя дзеці вайны, дасылайце ў рэдакцыю «Звязды» свае ўспаміны пра Вялікую Айчынную. Вашы нататкі будуць публікавацца ў рубрыцы «Загубленае дзяцінства». Такім чынам разам ушануем вашу памяць, раскрыем нязведаныя старонкі мінулага і, магчыма, паўплываем на тое, што ў краіне з'явіцца асобны дзень, прысвечаны вам.*